**РАШЭННЕ**
**па скарзе на дзеянні Выбарчай камісіі**

9 сакавіка 2026 года г. Варшава

Выбарчая камісія ў складзе Алены Прыходзька (Старшыні), Яраслава Бекіша, Алены Жылачкінай, Пятра Маркелава і Дзмітрыя Фурманава, разглядзеўшы на адкрытым пасяджэнні скаргу Сяргея Шалыгіна на дзеянні Выбарчай камісіі і заслухаўшы яго вусныя тлумачэнні,

**ВЫЗНАЧЫЛА**:

4 сакавіка 2026 года у 16 гадзін 26 хвілін на адрас Выбарчай камісіі паступіла скарга Сяргея Шалыгіна, у якой заяўнік сцвярджае, што дзеянні Выбарчай камісіі, што праявіліся ў падрыхтоўцы тэхнічнага задання па функцыянаванні лічбавай платформы для галасавання без уліку магчымасці верыфікацыі выбаршчыкаў праз від на жыхарства, парушаюць права беларускіх грамадзян на волевыяўленне.

Паводле зместу скаргі мноства беларусаў не маюць магчымасці прагаласаваць на выбарах у Каардынацыйную раду праз адсутнасць беларускага пашпарту або пашпарту Новай Беларусі. Паводле сцвярджэння заяўніка від на жыхарства маюць амаль усе беларусы, якія вымушана з'ехалі з краіны, а абмежаванне галасаваць з выкарыстаннем віда на жыхарства заяўнік лічыць штучна створаным, што парушае правы выбаршчыкаў. Заяўнік просіць:

1. даць магчымасць прагаласаваць грамадзянам Беларусі на выбарах у Каардынацыйную раду праз індывідуальную верыфікацыю, калі чалавек яшчэ не мае віда на жыхарства;
2. даць магчымасць прагаласаваць грамадзянам Беларусі на выбарах у Каардынацыйную раду праз верыфікацыю па віду на жыхарства;
3. пры немагчымасці рэалізаваць дадзеныя правы беларусаў разглядзець магчымасць пераносу выбараў да моманту рэалізацыі такой магчымасці для ўсіх грамадзян.

На адкрытым пасяджэнні заяўнік падтрымаў скаргу і дадаткова патлумачыў наступнае. Калі ён балатаваўся ў склад Каардынацыйнай рады папярэдняга склікання, ягоныя сябры не маглі прагаласаваць за яго з прычыны адсутнасці пашпартоў. Таксама ён патлумачыў, што па словах Наталлі Калегавай, яна перавозіла праз мяжу каля 2-3 тысяч беларусаў і ў

такіх выпадках звычайна людзі не мелі дакументаў. Таксама каля 150 чалавек былі прымусова дэпартаваны з Беларусі і нейкая частка з іх не мае пашпартоў. Лічыць несправядлівым немагчымасць дадзеных катэгорый асобаў прагаласаваць на выбарах і ў сувязі з гэтым правядзенне выбараў паводле зацверджаных дакументаў (пашпарт Рэспублікі Беларусь, пашпарт Новай Беларусі) недапушчальна.

Выбарчая Камісія разглядзела просьбы заяўніка, адлюстраваныя ў скарзе паасобку.

**1. Магчымасць прагаласаваць грамадзянам Беларусі на выбарах у Каардынацыйную раду праз індывідуальную верыфікацыю, калі чалавек яшчэ не мае віда на жыхарства.**

Згодна з пп. 2.2 п. 2 Палажэння аб выбарах у Каардынацыйную раду (далей - Палажэнне) удзел у галасаванні прадугледжвае праходжанне працэдуры верыфікацыі асобы. У адпаведнасці з пп. 9.3 п. 9 Палажэння выбаршчык праходзіць верыфікацыю на лічбавай платформе, пасля чаго яму надаецца доступ да галасавання.

Вышэйпрыведзеная норма з’яўляецца імператыўнай і не пакідае магчымасці праводзіць верыфікацыю асобы ўручную без выкарыстання лічбавых тэхналогій. Увядзенне гэтай нормы ў Палажэнне пераследуе мэты бяспечнага волевыяўлення выбаршчыкаў і магчымасці правесці верыфікацыю ўсіх ахвочых прагаласаваць ва ўмовах абмежаванасці чалавечымі і тэхнічнымі рэсурсамі Выбарчай камісіі.

Згодна з пунктам 1 Устаноўчай дамовы аб сумеснай дзейнасці чальцоў Выбарчай камісіі па правядзенні выбараў у Каардынацыйную Раду IV склікання кампетэнцыя і дзейнасць Выбарчай камісіі вызначаецца згодна з прынятым 20 студзеня 2026 года Палажэннем аб выбарах у Каардынацыйную Раду і не можа супярэчыць яму.

З гэтай прычыны прыняццё рашэння аб правядзенні індывідуальнай верыфікацыі парушыла б патрабаванні Палажэння і з’яўлялася б перавышэннем паўнамоцтваў Выбарчай камісіяй.

**2. Магчымасць прагаласаваць грамадзянам Беларусі на выбарах у Каардынацыйную раду праз верыфікацыю па віду на жыхарства.**

2.1. Выбарчая камісія прыходзіць да высновы, што задавальненне скаргі Сяргея Шалыгіна ў дадзенай частцы прывядзе да парушэння стандарту перыядычнасці выбараў, прадугледжанага, у прыватнасці пп. 7.1 п. 7 Дакумента Капенгагенскай Нарады канферэнцыі па чалавечым вымярэнні АБСЕ (1990). Выбары павінны ажыццяўляцца ў прадказальныя тэрміны, рэгулярна, адвольны перанос выбараў не дапускаецца.

Пры падрыхтоўцы Тэхнічнага задання чальцы Выбарчай камісіі задавалі пытанні спецыялістам, ці магчыма забяспечыць правядзенне галасавання выбаршчыкаў праз віды на жыхарства замежных краін, на што

быў атрыманы адказ, што гэта магчыма, але запатрабуе дадатковы месяц працы для наладжвання лічбавай платформы, што, у сваю чаргу, прывядзе да пераносу тэрмінаў галасавання прыкладна на адзін месяц і выдаткавання істотных матэрыяльна-тэхнічных рэсурсаў для забеспячэння дзейнасці лічбавай платформы, якіх на дадзены момант у Выбарчай камісіі не стае і не прадбачыцца.

Што тычыцца мажлівасці перанесці галасаванне на адзін месяц, Выбарчая камісія прыходзіць да высновы аб немагчымасці гэта зрабіць праз наступнае.

Згодна з Рашэннем Каардынацыйнай рады "Аб прызначэнні даты выбараў у 4-е скліканне Каардынацыйнай рады" ад 3 снежня 2025 года галасаванне прызначана на трэці тыдзень траўня 2026 года, што адпавядае датам з 11 па 17 красавіка 2026 года.

У адпаведнасці з пп. 1.1.1 пункта 1 Статута (Рэгламента) Каардынацыйнай рады Беларусі (далей - Статут) Каардынацыйная рада складаецца з 80 дэлегатаў, якія абіраюцца тэрмінам на два гады на аснове ўсеагульнага, свабоднага, роўнага і прамога выбарчага права пры таемным галасаванні. Згодна з пп. 2.2. п.2 Статута тэрмін дзеяння паўнамоцтваў дэлегата Каардынацыйнай рады складае два гады з моманту правядзення першага Агульнага пасяджэння яго складу. Паводле пп 2.2.1. п.2 Статута Першае пасяджэнне новага складу Каардынацыйнай рады праводзіцца не пазней як у месячны тэрмін пасля абвяшчэння вынікаў выбараў.

Першае Агульнае пасяджэнне Каардынацыйнай рады III склікання адбылося 12 чэрвеня 2024 года. Адпаведна дзейныя дэлегаты Каардынацыйнай рады пазбавяцца сваіх мандатаў і не змогуць ажыццявіць свае паўнамоцтвы каб забяспечыць перадачу мандатаў дэлегатам Каардынацыйнай рады IV склікання пасля 12 чэрвеня 2026 года.

Акрамя таго канчатковыя вынікі выбараў у Каардынацыйную раду IV склікання пры правядзенні галасавання ў перыяд з 11 па 17 траўня, павінны быць агучаны ў перыяд з 21 па 23 траўня 2026 года. Адпаведна, для правядзення Агульнага пасяджэння новага складу Каардынацыйнай рады застаецца менш за адзін месяц.

У адпаведнасці з пунктам 9 Заўвагі агульнага парадку №25 да Міжнароднага пакта аб грамадскіх і палітычных правах сапраўдныя перыядычныя выбары ў адпаведнасці з пунктам b) [артыкула 25 Пакта] маюць найважнейшае значэнне для забеспячэння падсправаздачнасці прадстаўнікоў грамадзян у сувязі з ажыццяўленнем імі заканадаўчых або выканаўчых паўнамоцтваў, якімі яны надзелены. Такія выбары павінны праводзіцца праз прамежкі часу, якія не з'яўляюцца празмерна працяглымі і забяспечваюць становішча, калі ўладныя паўнамоцтвы ўрада нязменна грунтуюцца на свабодным волевыяўленні выбаршчыкаў.

У такіх варунках перанос датаў галасавання на тэрмін 1 месяц прыводзіць да немагчымасці выканаць патрабаванні Статута, пазбаўлення мандатаў дзейных дэлегатаў Каардынацыйнай рады і можа выклікаць

абурэнне грамадскасці і выбарчых суб’ектаў з прычыны неабгрунтаванага зацягвання выбарчага працэсу.

2.2. Выбарчая камісія прыходзіць да высновы, што задавальненне скаргі Сяргея Шалыгіна ў дадзенай частцы прывядзе да парушэння стандарту прававой вызначанасці, у прыватнасці, прадугледжанага шматлікімі дакументамі Еўрапейскай камісіі за дэмакратыю праз права (Венецыянскай камісіі).

Неадпавяданне чаканням грамадскасці адносна тэрмінаў правядзення электаральнай працэдуры можа негатыўна ўплываць на выбарчшыкаў, кандыдатаў і ствараць дадатковыя абмежаванні для ўдзельнікаў выбарчага працэсу.

Немагчымасць правесці галасаванне ў агучаны Выбарчай камісіяй і зацверджаны рашэннем Каардынацыйнай рады тэрмін з 11 па 17 траўня 2026 года можа нанесці шкоду рэалізацыі палітычных правоў патэнцыйных удзельнікаў электаральнай кампаніі і негатыўным чынам уплываць на давер грамадскасці да выбараў.

2.3. У сваёй скарзе і вусных тлумачэннях Сяргей Шалыгін не адзначыў, віды на жыхарства якіх краін мусяць прымацца для верыфікацыі выбаршчыкаў праз лічбавую платформу.

На дадзены момант у свеце налічваецца 193 краіны-чальцы ААН, пераважная большасць з каторых маюць дакументы, што даюць дазвол на пражыванне. Прыняцце адных дакументаў і адмова прымаць іншыя без абгрунтаваных падставаў з’яўляецца дыскрымінацыйным і парушае пп. 1.2 п.1 Палажэння. Адпаведна, мяркуецца, што верыфікацыя выбаршчыкаў мусіць адбывацца паводле ўсіх відах на жыхарства, выдадзеных замежнымі краінамі.

Аналіз усіх дакументаў, якія могуць пацвярджаць асобу і беларускае грамадзянства, наладжванне лічбавай платформы для іх прыняцця і тэставання, у тым ліку на прадмет выключэння дэдуплікацыі, вымагае велізарнага аб’ёму матэрыяльна-тэхнічных рэсурсаў і працы Выбарчай камісіі, што з высокай верагоднасцю з’яўляецца невыканальнай задачай у межах выбарчай кампаніі, для мэтаў правядзення каторай абрана Выбарчая камісія (*Impossibilium nulla obligatio est*).

Такім чынам, верыфікацыя выбаршчыкаў праз віды на жыхарства замежных краін з’яўляецца практычна не здзяйсняльнай і не можа быць адобрана Выбарчай камісіяй.

**3. Разгляд магчымасці пераносу выбараў пры немагчымасці рэалізаваць дадзеныя правы беларусаў да моманту рэалізацыі такой магчымасці для ўсіх грамадзян.**

Пры заслухванні аргументацыі Сяргея Шалыгіна Выбарчая камісія прыходзіць да высновы, што пад пераносам выбараў заяўнікам меўся на ўвазе перанос тэрмінаў галасавання.

Выбарчая камісія лічыць магчымым задаволіць просьбу Сяргея Шалыгіна, паколькі яна не супярэчыць Палажэнню.

Кіруючыся пп. 4.9.5 п.4 Палажэння аб выбарах у Каардынацыйную раду, п. 16 Рэгламента працы Выбарчай камісіі па правядзенні выбараў у Каардынацыйную Раду IV склікання, Выбарчай камсіяй

**ВЫРАШЫНА:**

Скаргу Сяргея Шалыгіна задаволіць часткова - паставіць на разгляд чарговага адкрытага пасяджэння Выбарчай камісіі пытанне аб пераносе тэрмінаў галасавання пры немагчымасці правядзення індывідуальнай верыфікацыі ў выпадках адсутнасці ў асобы віда на жыхарства і немагчымасці правядзення верыфікацыі паводле віда на жыхарства.

У просьбе Сяргея Шалыгіна даць магчымасць прагаласаваць грамадзянам Беларусі на выбарах у Каардынацыйную раду праз індывідуальную верыфікацыю, калі чалавек яшчэ не мае віда на жыхарства - адмовіць.

У просьбе Сяргея Шалыгіна даць магчымасць прагаласаваць грамадзянам Беларусі на выбарах у Каардынацыйную раду праз верыфікацыю па віду на жыхарства - адмовіць.

**Старшыня Выбарчай камісіі** **Алена Прыходзька**